УДК 993

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ-ТЭОЛАГАЎ (з вопыту валанцерскай працы ў Мінскім тэалагічным каледжы імя св. Яна Хрысціцеля)

**Шымак Алена Казіміраўна**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*Выкладанне гісторыі для будучых тэолагаў мае свае асаблівасці. Немагчыма разглядаць гэтую дысцыпліну, не спасылаючыся на хрысціянскія каштоўнасці. У артыкуле разгялядаюцца некаторыя аспекты каталіцкага веравучэння адносна гісторыі, яе сутнасці і ролі ў жыцці.*

На працягу двух гадоў студэнты Мінскага тэалагічнага каледжа імя св. Яна Хрысціцеля вывучаюць курс «Гісторыя Касцёла»[1]. Сваю першую сустрэчу са студэнтамі каледжа заўсёды распачынаю з пытання: «А дзе мы ўпершыню сустракаемся з гісторыяй? Што такое гісторыя?».

Нашы дзеці пачынаюць вывучаць гісторыю ў 5 класе, дзе знаёмяцца з асноўнымі падзеямі Старажытнага свету. Потым распачынаецца гісторыя Сярэднявечча, пасля падлеткаў накрывае вір гісторыі дзяржаў, войнаў, канфліктаў, дыпламатычных адносін і г.д… Што ж з'яўляецца рухавіком гісторыі? тавар-на-грашовыя адносіны? можа так папулярны сёння гендар? Апошнім часам гісторыкі захапляюцца мікрагісторыяй: лёс асобнага чалавека, асобнай сацыяльнай групы, асобнай з'явы на невялікім прамежку часу. Грамадства адкрывае ўсё новыя гарызонты даследавання. І гэта можна проста растлумачыць. Святы Хосэмарыя Эскрыва казаў, што калі свет – справа рук Божых, калі Бог стварыў чалавека паводле свайго вобразу і падабенства і ўклаў у яго іскру свайго святла, то чалавечы розум імкнецца асэнсаваць Божую сутнасць ва ўсіх створаных рэчах [5, с. 32].

Як у гісторыі Усходу, так і ў гісторыі Захаду можна заўважыць, што чалавека заўсёды турбавала пытанне пра сэнс рэчаў і пра сэнс уласнага існавання. Святы

[1] Мінскі тэалагічны каледж імя св. Яна Хрысціцеля – каталіцкая навучальная ўстанова для свецкіх асобаў, якая паўстала з Цэнтра падрыхтоўкі катэхетаў у Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі. Дзяржаўную рэгістрацыю Мінскі тэалагічны каледж імя св. Яна Хрысціцеля атрымаў 29 жніўня 2013 года. Навучэнцы маюць магчымасць атрымання адпаведнай касцёльнай кваліфікацыі: касцёльны сурдаперакладчык, катэхет, куратар пілігрымак, кантар, супрацоўнік каталіцкіх сродкаў масавай камунікацыі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ян Павел II казаў, што дастаткова хоць бы бегла прыгледзецца да старажытнай гісторыі, каб яўна заўважыць, як у розных частках свету, дзе развіваліся розныя культуры, людзі адначасова пачыналі задаваць сабе галоўныя пытанні, што спадарожнічаюць усяму чалавечаму быццю. Чалавек імкнецца здабыць пэўныя элементы ўніверсальных ведаў, якія дазваляюць яму лепш разумець самога сябе і ўсё больш поўна сябе рэалізоўваць. Гэтыя асноўныя веды бяруць пачатак са ***здзіўлення***, якое абуджае ў ім сузіранне таго, што створана: чалавек са здзіўленнем адкрывае, што жыве ў свеце і звязаны з іншымі істотамі, падобнымі да сябе, з якімі яго яднае агульнае прызначэнне. Менавіта ў гэты момант ён ступае на шлях, па якім будзе потым ісці да адкрыцця ўсё новых гарызонтаў ведаў. Без здольнасці здзіўляцца чалавек трапіў бы ў руціну, перастаў бы развівацца і паступова стаў бы нездольны да жыцця сапраўды асабістага [1].

Гістарычная навука таксама мае ў сабе гэтае імкненне да праўды, імкненне растлумачыць канкрэтны ход і заканамернасці развіцця чалавечага грамадства. Выдатны даследчык гісторыі Касцёла Й.Лорц адзначаў, што сукупнасць фактаў, дат і падзей не ёсць гісторыя – хай нават усе даты дакладныя і факты правераныя. Самы поўны каталог мастацкага музея – гэта не гісторыя мастацтваў. Гісторыя – гэта «дзеянне духу» [3].

Займацца гісторыяй – гэта як складаць пазл. Часта даследчык сутыкаецца з рэшткамі недакладных звестак, з кавалкамі галаваломкі, якая здаецца вельмі вялікай і вельмі сапсаванай, каб яе можна было аднавіць. Гісторыя Касцёла – гэта не толькі гісторыя рымскіх папаў, гісторыя палітычных канфліктаў, дзеянні вялікіх святых. Святое Пісанне з самага пачатку чалавечай гісторыі паказвае праз гісторыю Каіна і Авеля наяўнасць у чалавеку гневу, сквапнасці, гардыні – вынікаў першароднага граху (Быц 4, 10-11). Сляды граху лягчэй заўважыць, святасць відавочная не заўсёды. Але гісторыя – гэта таксама гісторыя дзення Святога Духа.

«Historia est magistra vitae». Гісторыя – настаўніца жыцця. У гэтым антычным выслоўі ёсць глыбокі сэнс. Пытаючыся пра сутнасць гэтага выразу, часта даводзіцца чуць, што мы павінны вучыцца на памылках мінулага. Што ў гісторыі можна ўбачыць шмат добрых натхняльных прыкладаў. І гэта ўсё так. Але галоўны сэнс у тым, і аб гэтым нагадвае Катэхізіс Каталіцкага Касцёла, што ад пачатку хрысціянскай гісторыі «панаванне Езуса замацавана над светам і гісторыяй» [ККЦ 450][1]. Менавіта Хрыстус ёсць Панам сусвету і гісторыі [ККЦ 668]. Касцёл – гэта людзі, якіх Бог збірае па ўсім свеце. Касцёл – гэта Цела Хрыста. Таму на тых, хто даследуе альбо вывучае гісторыю Касцёла ляжыць вялікая адказнасць разглядаць гісторыю, якая адлюстроўваецца ў Святым Пісанні, гісторыю – як дар, гісторыю – як таямніцу.

Гісторыя, як навука мае, свае навуковыя метады, прынцыпы, інструменты даследавання, якія патрабуюць аб'ектыўнасці, праўдзівасці.

Гісторыя Касцёла як навуковая гістарычная дысцыпліна таксама абапіраецца на цэлы шэраг навуковых прынцыпаў. Але трымаючы на ўвазе навуковыя патрабаванні, у гэтым курсе важна імкнуцца разглядаць гісторыю вачыма веры. «Малітва звязана з чалавечай гісторыяй, яна з'яўляецца сувяззю з Богам у гістарычных падзеях» [ККЦ 2568].

[1] Катехизис Католической Церкви (ККЦ). – М.: Духовная библиотека, 2002. – 813 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Катэхізіс Каталіцкага Касцёла вучыць, што вера абапіраецца на дзеянне Бога ў гісторыі [ККЦ 2738]. Таму вывучаючы гісторыю Касцёла неабходна імкнуцца не толькі пазнаваць гістарычныя факты і падзеі, але праз гэта паглыбляць сваю веру.

Звяртаючыся да студэнтаў-тэолагаў хочацца ўзгадаць аднаго вельмі цікавага чалавека, які мог бы стаць прыкладам для тых, хто шукае гістарычную праўду. Такой асобай з'яўляецца Джон Генры Ньюмен [4]. Жыў у Англіі ў 1801-1890 гг. Быў выкладчыкам Оксфардскага ўніверсітэту і англіканінам. Ва ўзросце 44 гадоў стаў католікам, святаром, а пазней нават кардыналам. Жыццё гэтага даследчыка грунтавалася не толькі на навуковых прынцыпах, але таксама на малітве і пакоры. Вывучаў творы Айцоў Касцёла, вельмі любіў Літургію. Дж. Г. Ньюмен – вобраз чалавека, які ўвасобіў у сабе сугучнасць веры і навукі. Ён працаваў на ніве адукацыі і дзяцей, і студэнтаў, быў рэктарам універсітэта. Натхняючыся яго прыкладам, будзем імкнуцца да святасці ў штодзеннасці, адкрываць Божую волю ў сваёй прафесіі і з Божай дапамогай вывучаць гісторыю.

## Літаратура


1. FIDES ET RATIO. Энцыкліка Святога Айца Яна Паўла II // https://pro-christo.catholic.by/text/fides.htm.
2. Катехизис Католической Церкви. – М.: Духовная библиотека, 2002. – 813 с.
3. Лорц, Йозеф История Церкви: Рассмотренная в связи с историей идей / Йозеф Лорц. – М. : Христиан. Россия, 1999. – 511 с.
4. Ньюмен, Дж. Г. Идея Университета / Дж. Г. Ньюмен ; пер. с англ. С. Б. Бенедиктова ; под общ. ред. М. А. Гусаковского. – Минск : БГУ, 2006. – 208 с.
5. Эскрыва, Хосэмарыя. Хрыстус праходзіць побач / Хосэмарыя Эскрыва. – Мінск: Про Хрысто, 2014. – 360 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова